Апостал беларускай мовы

Аўтар: Рэдакцыя
29.05.2022 00:00



Узгадваем кс. Міхала Шалкевіча ў сотую гадавіну прызначэння яго пробашчам у Тракелях. “С**вяты Ойча! Больш за мільён беларусаў-католікаў у Польшчы, як частка 12-мільённага беларускага народу, стаўшы на шлях культурнага і**

палітычнага адраджэння, шпарка імкнецца ўперад. […] Гэная стагнацыя, гэная пераробка нашага роднага на чужое страсае нейкім жахам смерці кожную хоць крыху свядомую душу беларускую”. Такімі словамі пачынаецца “Мемарыял пятнаццаці” з 1925 года, адным з аўтараў якога з’яўляецца кс. Міхал Шалкевіч, руплівы абаронца беларушчыны. У згаданы перыяд заходняя частка беларускіх зямель знаходзілася пад уладай Польшчы, якая, у сваю чаргу, якраз падпісала канкардат з Апостальскай Сталіцай. Дакумент змяшчаў пункты, што ўскладнялі душпастырства беларусаў. Між іншым – немагчымасць увядзення беларускамоўных казанняў і набажэнстваў, бо змена мовы ў гэтых выпадках магла быць здзейснена толькі з дазволу канферэнцыі біскупаў Польшчы. Гэта і падштурхнула 15 беларускіх святароў на чале з кс. Шалкевічам, тагачасным пробашчам у Тракелях, выступіць супраць палажэнняў канкардата, якія ўціскалі правы беларусаў.

Служэнне кс. Міхала прыпала на зменлівы і ліхі перыяд у гісторыі нашай краіны: Беларусь у складзе Расійскай імперыі, баявыя дзеянні І Сусветнай вайны на нашых тэрыторыях, пасля падзел фронтам і нямецкая акупацыя, затым рэвалюцыя ў Расіі і хваля актывізацыі розных сацыяльных груп, на заканчэнне – савецкі атэістычны час. Пры кожным становішчы кс. Шалкевіч захоўваў вернасць Хрысту і клопат пра беларускую індывідуальнасць.

Каб не настала “цемната рэлігійная” і “нацыянальная смерць”, як згадваецца ў “Мемарыяле”.

Аўтар: Рэдакцыя
29.05.2022 00:00



Аўтар: Рэдакцыя
29.05.2022 00:00

